Прапануем наведаць Плябань

Плябань - гэта маленькая вёска Маладзечанскага раёна, Мінскай вобласці Беларусі, якая размясцілася ўздоўж рэспубліканскай трасы Мінск - Маладзечна, на адлегласці ў некалькі кіламетраў ад вялікай вёскі Краснае.

Асноўнай славутасцю вёскі Плябань з'яўляецца царква Успення Прасвятой Багародзіцы. Гэты цагляны храм будаваўся ў вёсцы Плябань вельмі доўга, а менавіта з 1800 года і да 1858 года. Храм першапачаткова быў узведзены ў якасці касцёла. Падчас народнага паўстання 1863-64 гадоў гэты касцёл у вёсцы Плябань выкарыстоўваўся паўстанцамі ў якасці таемнага арсенала. Адпаведна, пасля падаўлення паўстання касцёл быў зачынены царскімі ўладамі. У

1872 годзе касцёл быў перададзены Праваслаўнай Царкве. У перыяд з 1921 года і па 1939 год, калі вёска Плябань ўваходзіла ў склад міжваеннай Польшчы, храм зноў функцыянаваў у якасці каталіцкага касцёла. Падчас Другой Сусветнай Вайны храм моцна пацярпеў. У другой палове 20-га стагоддзя царква ў вёсцы Плябань была занядбана і ператварылася ў руіны. У 1996 годзе храм зноў быў перададзены Праваслаўнай Царкве. Першы і асноўны этап рэстаўрацыі храма ў вёсцы Плябань завяршыўся ў 2007 годзе, пасля гэтага царква зноў стала дзеючай. Аднак, пэўныя аднаўленчыя працы ў храме вядуцца аж да нашага часу.

Побач з царквой у вёсцы Плябань захавалася таксама старадаўняя двух'ярусная званіца. Тэрыторыя вакол храма акружаная каменнай агароджай. Званіца і агароджа былі ўзведзены разам з самім храмам ў 19-ым стагоддзі. На сённяшні дзень царква Успення Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Плябань з'яўляецца важным культурным, гістарычным і архітэктурным помнікам 19-га стагоддзя, а таксама цікавай славутасцю Беларусі.

Плябанія размешчана праз дарогу ад храма, які на момант пабудовы плябаніі яшчэ быў касцёлам. Плябанія - гэта дом каталіцкага святара. На сённяшні дзень ў яе сценах размешчаны - Цэнтр традыцыйнай культуры і побыту, які прадастаўляе шырокі спектр паслуг для турыстаў і падарожнікаў:

- самастойны агляд альбо экскурсіі па выставачных залах музея;
- у цэнтры традыцыйнай культуры і побыту ў вёсцы Плябань праводзіцца мноства розных тэматычных мерапрыемстваў, гульняў, этнаграфічных вечарын і майстар-класаў з удзелам фальклорных калектываў;
- тут маецца магчымасць правядзення прыватных сямейных святаў і ўрачыстасцяў у спецыяльна абсталяванай банкетнай зале.

Такім чынам, дадзеная плябанія на сённяшні дзень з'яўляецца не толькі важным архітэктурным помнікам 19-га стагоддзя, але і вельмі прывабнай для турыстаў і падарожнікаў славутасцю, а таксама цэнтрам культурнага жыцця самой вёскі. Вёска Плябань ў свой час была названая ў гонар мясцовай плябаніі, якая і па гэты дзень з'яўляецца галоўнай візітнай карткай паселішча.

Прапануем наведаць Плябань! А мы тут ужо пабывалі!